# Школьная планета

*НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!* *№ 6* *Люты 2017*

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*


# Фінансавая граматнасць




## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## *ФІНАНСАВАЯ АЗБУКА*

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** з'яўляееца цэнтральным банкам і дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь.

- Яму належыць выключнае права эмісіі грошай. Гэта ажыццяўляецца з дапамогай выпуску ў абарачэнне безнаяўных і наяўных грошай.
- Вызначае намінал, малюнак, ступені абароны і іншыя характарыстыкі банкнот і манет.
- Ажыццяўляе публікацыю апісання банкнот і манет у СМІ.
- Забяспечвае друкаванне банкнот, чаканку манет.



# Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## КАНЦЭПЦЫЯ ДЫЗАЙНА МАНЕТ







На **аверсе** (пярэднім баку) манет прадстаўлены дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца адным з сімвалаў дзяржавы.




На **рэверсе** (адваротным баку) манет пазначаны намінал, а таксама раскрываецца тэма аднаго з напрамкаў народнай творчасці – **ткацтва** – старажытнага рамяства, які ўвасабляе ў сабе культурна-гістарычную інфармацыю развіцця Беларусі.

*Бізнес — займальная гульня, у якой максімум рызыкі спалучаецца з мінімумам правілаў. А кошт у гэтай гульні вядзецца ў грошах.*

*Біл Гейтс - амерыканскі прадпрымальнік і грамадскі дзеяч, адзін са стваральнікаў і былы найбуйнейшы акцыянер кампаніі Microsoft.*





*Грошы, вядома, дэспатычныя магутнасьць, але ў той жа час і найвышэйшая роўнасць, і ў гэтым уся іх галоўная моц. Грошы могуць зраўнаваць усе няроўнасці.*

*Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі (1821 — 1881) — рускі пісьменнік, мысляр, філасаф і публіцыст. Член-карэспандэнт Пецярбургскай АН з 1877 года.*

# Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## 1 КАПЕЙКА









**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 1, злева ад яго – надпіс КАПЕЙКА, справа намаляваны нацыянальны арнамент, які сімвалізуе ***багацце і дастатак***

**Гурт:**
роўны

Дыяметр – 15,00 мм; маса – 1,55 г.; таўшчыня – 1,25 мм;
сплаў – сталь, пакрытая меддзю; колер – чырвоны.

## 2 КАПЕЙКІ









**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 2, злева ад яго – надпіс КАПЕЙКА, справа намаляваны нацыянальны арнамент

**Гурт:**
роўны

Дыяметр – 17,50 мм; маса – 2,10 г.; таўшчыня – 1,25 мм;
сплаў – сталь, пакрытая меддзю; колер – чырвоны.

# Ведай свае грошы!

## 5 КАПЕЕК







**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 5, злева ад яго – надпіс КАПЕЕК, у цэнтры – выява нацыянальнага арнаменту

**Гурт:**
роўны

Дыяметр – 19,80 мм; маса – 2,70 г.; таўшчыня – 1,25 мм; сплаў – сталь, пакрытая меддзю; колер – чырвоны.

## 10 КАПЕЕК







**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 10, злева ад яго – надпіс КАПЕЕК, у лічбе 0 – выява нацыянальнага арнаменту, што сімвалізуе ***ўрадлівасць і жыццёвую сілу***

**Гурт:**
насечка з сегментамі

Дыяметр – 17,70 мм; маса – 2,80 г.; таўшчыня – 1,80 мм; сплаў – сталь, пакрытая меддзю і латунню; колер – жоўты.

# Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## 20 КАПЕЕК









**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 20, злева ад яго – надпіс КАПЕЕК, у лічбе 0 – выява нацыянальнага арнаменту

**Гурт:**
насечка з сегментамі

Дыяметр – 20,35 мм; маса – 3,70 г.; таўшчыня – 1,85 мм;
сплаў – сталь, пакрытая меддзю і латунню; колер – жоўты.

## 50 КАПЕЕК









**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 50, злева ад яго – надпіс КАПЕЕК, у лічбе 0 – выява нацыянальнага арнаменту

**Гурт:**
насечка з сегментамі

Дыяметр – 22,25 мм; маса – 3,95 г.; таўшчыня – 1,55 мм;
сплаў – сталь, пакрытая меддзю і латунню; колер – жоўты.

## Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### 1 РУБЕЛЬ









**Аверс:**
рэльефная выява дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім надпіс у два радкі: БЕЛАРУСЬ, 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 1, злева ад яго – надпіс РУБЕЛЬ, справа ад лічбы – выява нацыянальнага арнаменту, што сімвалізуе ***імкненне чалавека да шчасця і свабоды***

**Гурт:** насечка

Дыяметр – 21,25 мм; маса – 5,60 г.; таўшчыня – 2,30 мм; сплаў – сталь, пакрытая меддзю і нікелем; колер – белы.

### 2 РУБЛІ









**Аверс:**
у цэнтры рэльефная выява дзяржаўнага герба РБ; па крузе надпіс: уверсе – БЕЛАРУСЬ, унізе – 2009

**Рэверс:**
у цэнтры – лічбавае абазначэнне наміналу 2, злева ад яго – надпіс РУБЛІ, справа і злева ад лічбы – выява нацыянальнага арнаменту, што сімвалізуе ***імкненне чалавека да шчасця і свабоды***

**Гурт:** з надпісам БЕЛАРУСЬ, падзеленым элементам нацыянальнага арнаменту

Дыяметр – 23,50 мм; маса – 5,81 г.; таўшчыня – 2,00 мм; сплаў : кальцо - сталь, пакрытая меддзю і латунню, сярэдзіна – сталь, пакрытая меддзю і нікелем; колер: кальцо – жоўтае, сярэдзіна - белая.

Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Прыкметы сапраўднасці манет

*Манеты ў параўнанні з банкнотамі не маюць шмат прыкмет для абароны ад фальсіфікацыі. Сапраўдныя манеты адрозніваюцца ад падробленых якасцю матэрыялу і дакладнасцю выканання чаканкі. Прывядзём некалькі спосабаў праверкі сапраўднасці манет для выяўлення фальшывых манет.*

## ГУК пры ўдары манеты на цвёрдай аснове

Сапраўдныя манеты маюць поўны чысты гук, а выробленыя ліццём (падробленыя) – глухі гук.

Падробленыя манеты, выробленыя чаканкай, маюць больш светлы гук.



## ВЫГІБ

Сапраўдныя манеты сагнуць ўручную немагчыма. Некаторыя падробкі можна сагнуць, асабліва выробленыя ліццём.

## МАГНЕТЫЗМ

Манеты ўсіх наміналаў валодаюць моцным магнетызмам.

## МАЛЮНАК. Якасць чаканкі

Выявы на сапраўдных манетах выразна бачныя на фоне роўнай і гладкай паверхні. Падробкі часта не маюць выразных контураў малюнкаў.

## КОЛЕР

Манеты наміналам 1, 2 і 5 капеек маюць чырвоны колер.

Манеты наміналам 10, 20 і 50 капеек – жоўты колер.

Манета наміналам 1 рубель мае белы колер.

2 рублі: кальцо – жоўты; сярэдзіна – белы. 1, 2 і 5 капеек – гурт роўны.

## ГУРТ

10, 20 і 50 капеек – гурт з сегментамі. 1 рубель – гурт з насечкай. 2 рублі – гурт з надпісам БЕЛАРУСЬ, падзелены элементамі нацыянальнага арнаменту.

Колькасць падробленых грашовых знакаў, выяўленых у 2015 – 2016 гг.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

| Найменне валюты | 2015 г. | 2016 г. |
|---|---|---|
| Долары ЗША | 534 | 546 |
| Еўра | 153 | 120 |
| Расійскія рублі | 330 | 438 |
| Беларускія рублі | 20 | 19<br>у тым ліку 10 – узору 2009 года |

Выяўленыя падробленыя грашовыя знакі па відах валют, % (2016 г.)

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ




ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына